УДК 94

# ІУДЭЙСКАЯ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ Ў ЕГІПЦЕ Ў ПЕРСІДСКІ ПЕРЫЯД

Г. В. ДЗЯГЕЛЬ
Міжнародны ўніверсітэт «МІПСА»
Мінск, Беларусь

**Уводзіны.** Час панавання дзяржавы Ахеменідаў на Блізкім Усходзе (VI–IV стст. да н. э.)з'яўляецца часам фармавання іудэйскай ідэнтычнасці. Выразна гэта паўстае ў кнігах Старога Запавету Эзры і Нехем'і. Але гэтыя тэксты былі моцна адрэдагаваныя. Каштоўнымі крыніцамі з'яляюцца для нас па-за біблейскія сведчанні. У прыватнасці арамейскія папірусы з вострава Элефанціна, дзе знаходзілася іудэйская ваенная калонія.

**Асноўная частка.** У папірусах гэтая група называецца *yhwdyʾ*, што можна перакласці як ягудзіты, то бок саманазва звязана са словам Йехуд (Іудзея). Арамейскі назоўнік yəhûdāy сустракаецца з Старым Запавеце некалькі разоў: Эзра 4:12, 13; 5:1, 5; 6:7-8, 14; Дан. 3:8, 12. У гэтых кантэкстах назоўнік азначае «чалавек, што паходзіць з Іўдзеі, іўдзей«. Такім чынам, па-беларуску слушна перадаваць гэтую саманазву як іўдзеі, адпаведна гэтакжа называць чальцоў абшчыны ў Егіпце.

Важным спосабам ідэнтыфікацыі іўдзеяў з'яўляюцца тэамофныя імёны. Хаця і трэба адносіцца да гэтых сведчанняў з асцярожнасцю, бо імя можа ў большай ступені адлюстроўваць рэлігійныя погляды бацькоў. Так у тэкстах з Элефанціны засведчана ўсяго каля 250 імёнаў. З із тэаморфных з элементам yahô ўсяго некалькі. Амаль ўсе тэаморфныя імёны ўтрымліваюць элемент *yhw* альбо *yh* як тэаморфны элемент. Элемент *ʾdn*, «гасподзь, спадар» не зафіксаваны. Вядома адно імя з элементам *bʿl*, «Баал», але не зразумела ці належыць яно іудзею. Элемент *ʾl* не засведчаны ў Элефанціне як тэаморфны элемент [1, с. 38]. Для параўнання у кнігах Эзры і Нехем'і ён наадварот выкарыстоўваецца даволі часта. Вось некалькі прыкладаў:

*מוזיה* *Mauziah*, «*Яхо – прыстанішча маё*»;
*תקותיה* *Tiqwatiah*, «*Яхо – мая надзея*»;
*עמנויה* *Immanuiah*, «*Яхо – з намі*».

Іўдэі Элефанціны верылі, што YHW, «бог, што жыве ў крэпасці Элефанціна», дасяжны ў сваім храме ў паўднёвым Егіпце [2, с. 364]. Насуперак ўяўленням, што адлюстраваным ў Старым Запавеце аб тым, што ў іудзеяў можа існаваць толькі адзін храм, і толькі ў Іерусаліме. Але зусім не насуперак агульнаблізкаўсходнім ўяўленням, згодна з якімі старажытнаўсходні чалавек не адрозніваў боства ад яго выявы, бачыў ідал сапраўдным, жывым богам [3, с. 149].

**Заключэнне.** Такім чынам, можна прыйсці да высновы, што яркай праявай ідэнтычнасці была саманазва *yhwdy*ʾ, якая паказвала сувязь элефанцінскай абшчыны з гістарычнай радзімай – Іўдзеяй. Другім элементам ідэнтычнасці была рэлігія, што праяўлялася ў самім існаванні храма Яхве, таксама ў выкарыстанні тэаморфных імёнаў.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. **Becking, B.** Identity in Persian Egyp: The Fate of the Yehudite Community of Elephantine / B. Becking. – University Park, Pennsylvania, The Pennsylvania State University Press, 2020. – 209 p.

2. **Granerød, G.** Canon and Archive: Yahwism in Elephantine and Āl-Yāhūdu as a Challenge to the Canonical History of Judean Religion in the Persian Period / G. Granerød // Journal of Biblical Literature. – 2019. – № 2 (138). – P. 345–364.

3. **Вейнберг, И. П.** Человек в культуре древнего Ближнего Востока / И. П. Вейнберг. – Москва: Наука, 1989. – 208 с.